Установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
Першы прарэктар БДУКМ
________________ А. А. Корбут
«____» _____________ 2016 г.
Рэгістрацыйны № ВД - _____ /вуч.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ІНСТРУМЕНТАЛЬНЫ АНСАМБЛЬ

*Вучэбная праграма*
*ўстановы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне*
*для спецыяльнасці 1-18 01 01 Народная творчасць*
*(па напрамках),*
*напрамку спецыяльнасці 1-18 01 01-02 Народная творчасць*
*(інструментальная музыка),*
*спецыялізацыі 1-18 01 01-02 02*
*Інструментальная музыка духавая*

Мінск
БДУКМ
2016

**СКЛАДАЛЬНІК**
*А. А. Караткевіч,* старшы выкладчык кафедры духавой музыкі ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»

**РЭЦЭНЗЕНТЫ:**
*У. І. Тарашкевіч,* дацэнт кафедры медных духавых інструментаў установы адукацыі «Беларуская дзяржаўная акадэмія музыкі», заслужаны артыст Рэспублікі Беларусь;
*В. А. Немцава,* старшы выкладчык кафедры народна-інструментальнай творчасці ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат мастацтвазнаўства

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:**
*кафедрай* духавой музыкі ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 1 ад 20.09.2015 г.);
*прэзідыумам* навукова-метадычнага савета ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 1 ад 29.10.2015 г.)

Адказны за рэдакцыю: В. Б. Кудласевіч
Адказны за выпуск: А. А. Караткевіч

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Падрыхтоўка студэнтаў па напрамку спецыяльнасці 1-18 01 01-02 Народная творчасць (інструментальная музыка) прадугледжвае сур'ёзную інструментальна-выканальніцкую падрыхтоўку і пастаяннае развіццё навыкаў ансамблевага музіцыравання на працягу ўсяго тэрміну навучання ва УВА, так як менавіта інструментальны ансамбль з'яўляецца адным з найбольш складаных відаў інструментальнага выканальніцкага мастацтва. Неабходна заўважыць, што запатрабаванасць прафесійных, аматарскіх і вучэбных саставаў у пачатковых, сярэдніх і вышэйшых спецыяльных установах культуры і мастацтваў – аб'ектыўная рэальнасць сучаснага духавога мастацтва, так як інструментальныя ансамблі, у параўнанні з аркестрамі, з'яўляюцца масавымі мастацкімі калектывамі.

Вывучэнне вучэбнай дысцыпліны «Інструментальны ансамбль» ажыццяўляецца ў цеснай узаемасувязі з такімі музычнымі дысцыплінамі, як «Сольнае і камерна-інструментальнае выканальніцтва», «Методыка работы з аркестрам і ансамблем», «Гісторыя музычнага мастацтва», «Аркестравы клас», «Тэорыя музыкі» і інш.

*Мэтай* вучэбнай дысцыпліны з'яўляецца фарміраванне ў студэнтаў ансамблева-выканальніцкіх навыкаў, неабходных для будучай прафесійнай творчай дзейнасці ў галіне духавога мастацтва.

*Задачы* вучэбнай дысцыпліны:

– падрыхтоўка да самастойнай творчай дзейнасці будучых маладых спецыялістаў, здольных на высокім прафесійным узроўні займацца як кіраўніцтвам інструментальнымі ансамблямі, так і выканальніцкай дзейнасцю ў лепшых традыцыях прагрэсіўных сусветных і нацыянальных выканальніцкіх школ ігры на духавых інструментах;

– фарміраванне і развіццё навыкаў сумеснага музіцыравання, авалоданне рознымі прыёмамі і відамі выканальніцкіх сродкаў ансамблевага майстэрства;

– засваенне студэнтамі музычна-педагагічнага рэпертуару і інструктыўнага матэрыялу па інструментальным ансамблі;

– знаёмства з прынцыпамі і метадамі арганізацыі розных саставаў інструментальнага ансамбля;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– практычнае знаёмства з асноўнымі прынцыпамі падрыхтоўкі і правядзення канцэртных выступленняў інструментальнага ансамбля;

– падрабязнае вывучэнне дасягненняў ансамблевага выканальніцтва на духавых інструментах.

Вучэбная дысцыпліна засноўваецца на глыбокім усебаковым вывучэнні дасягненняў музычнага мастацтва, на абагульненні вопыту лепшых выкладчыкаў і салістаў-выканаўцаў і разлічана на студэнтаў з розным узроўнем музычна-інструментальнай падрыхтоўкі. Рэпертуар фарміруецца з улікам індывідуальных асаблівасцей кожнага студэнта з твораў, размеркаваных з улікам асноўных дыдактычных прынцыпаў. Вучэбная праграма дае магчымасць студэнтам сістэмна і паслядоўна, з улікам апошніх дасягненняў выканальніцтва на духавых інструментах, авалодаць поўным аб’ёмам ведаў.

У працэсе навучання студэнты павінны *ведаць* наступныя пытанні:

– функцыі ўдзельніка інструментальнага ансамбля духавых і ўдарных інструментаў;

– патрабаванні да выканання асобных партый інструментальнага ансамбля;

– стадыі і формы правядзення рэпетыцыйных працэсаў у інструментальным ансамблі;

*умець:*

– выконваць ансамблевую партыю ў вучэбным калектыве з выкарыстаннем розных прыёмаў выканальніцкай тэхнікі;

– чытаць ансамблевыя партыі з ліста ў працэсе ансамблевага выканальніцтва;

– увасабляць музычна-слыхавыя прадстаўленні ў гучанні інструментальнага ансамбля;

– выконваць сольны фрагмент музычнага твора;

– дакладна выконваць патрабаванні кіраўніка інструментальнага ансамбля;

*валодаць:*

– настройкай асабістага інструмента для сумеснага музіцыравання ў розных саставах інструментальнага ансамбля (аднародныя, роднасныя, змешаныя);

– адчуваннем метрарытму;

– celнымі штрыхамі традыцыйных і спецыфічных прыёмаў гуказдабывання;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– адчуваннем стылю старадаўняй і сучаснай музыкі.

Метады і тэхналогіі навучання:

– выкарыстанне тэхнічных сродкаў навучання;

– праслухоўванне запісаў вядучых калектываў;

– прагляд відэаматэрыялаў;

– практычнае азнаямленне з музычным матэрыялам.

У адпаведнасці з вучэбным планам на вывучэнне вучэбнай дысцыпліны «Інструментальны ансамбль» усяго прадугледжана 706 гадзін, у тым ліку 356 гадзін – аўдыторныя (практычныя) заняткі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ПРЫКЛАДНЫ ТЭМАТЫЧНЫ ПЛАН

| Тэмы | Аўдыторныя (практычныя) заняткі |
|---|---|
| Уводзіны | 1 |
| *Тэма 1.* Інструментальны ансамбль духавых інструментаў: класіфікацыя, функцыянальныя і мастацка-выканальніцкія асаблівасці | 4 |
| *Тэма 2.* Сутнасць ансамблевага выканальніцтва | 12 |
| *Тэма 3.* Арганізацыйна-метадычныя асаблівасці работы з ансамблем духавых інструментаў | 15 |
| *Тэма 4.* Развіццё навыкаў чытання нот з ліста | 18 |
| *Тэма 5.* Настройка духавых інструментаў | 10 |
| *Тэма 6.* Інтанаванне ў практыцы ансамблевага выканальніцтва на духавых інструментах | 24 |
| *Тэма 7.* Сродкі выканальніцкай выразнасці як аснова мастацкага майстэрства ўдзельнікаў ансамбля духавых інструментаў | 32 |
| *Тэма 8.* Праблемы дынаміка-акустычнага балансу ў гучанні інструментальнага ансамбля | 34 |
| *Тэма 9.* Асаблівасці работы над метрарытмічнымі цяжкасцямі | 20 |
| *Тэма 10.* Штрыхі як сродак музычнай выразнасці | 28 |
| *Тэма 11.* Спецыфічныя прыёмы выканальніцтва на духавых інструментах | 18 |
| *Тэма 12*. Фразіроўка ў ансамблевым выканальніцтве | 24 |
| *Тэма 13.* Этапы работы над музычнымі творамі | 21 |
| *Тэма 14.* Увасабленне зместу музычных твораў, варыянтная шматлікасць іх трактовак | 16 |
| *Тэма 15*. Спецыфіка інтэрпрэтацыі старадаўняй музыкі | 22 |
| *Тэма 16*. Спецыфіка інтэрпрэтацыі сучаснай музыкі | 22 |
| *Тэма 17.* Падрыхтоўка да публічнага выступлення | 18 |
| *Тэма 18.* Творчыя дасягненні айчынных і замежных выканаўцаў на духавых інструментах у складзе інструментальных ансамбляў | 16 |
| **Усяго…** | **356** |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

## Уводзіны

Асноўная мэта, задачы, патрабаванні вучэбнай дысцыпліны «Інструментальны ансамбль». Змест вучэбнай дысцыпліны з улікам развіцця выканальніцкага майстэрства на духавых інструментах у сістэме вышэйшай адукацыі. Месца вучэбнай дысцыпліны «Інструментальны ансамбль» і асаблівасці яе ўзаемасувязі з іншымі вучэбнымі дысцыплінамі спецыялізацыі.

### *Тэма 1. Інструментальны ансамбль духавых інструментаў: класіфікацыя, функцыянальныя і мастацка-выканальніцкія асаблівасці*

Класіфікацыя тыпавых саставаў інструментальных ансамбляў духавых інструментаў. Крытэрыі аб'яднання духавых інструментаў у групы. Функцыянальнае значэнне груп.

Аднародныя, роднасныя, змешаныя саставы інструментальных ансамбляў і іх мастацка-выканальніцкія асаблівасці. Тыпавыя формы ансамбляў духавых інструментаў (дуэты, трыа, квартэты, квінтэты і інш.) і спецыфіка іх выкарыстання ў сучаснай канцэртнай практыцы.

### *Тэма 2. Сутнасць ансамблевага выканальніцтва*

Асновы ансамблевага музіцыравання. Шляхі развіцця навыкаў сумеснага выканальніцтва. Роля ансамблевага выканальніцтва ў працэсе фарміравання мастацкага густу. Значэнне ансамблевай практыкі ў развіцці творчых здольнасцей выканаўцаў на духавых інструментах.

### *Тэма 3. Арганізацыйна-метадычныя асаблівасці работы з ансамблем духавых інструментаў*

Крытэрыі фарміравання інструментальных ансамбляў з улікам базавай падрыхтоўкі ўдзельнікаў калектываў (вучэбныя і аматарскія саставы). Змест рэпетыцыйнай работы з удзельнікамі розных саставаў ансамбляў духавых інструментаў.

Прынцыпы фарміравання педагагічнага і канцэртнага рэпертуару з улікам творчых здольнасцей выканаўцаў. Прынцыпы дэдукцыі пры рабоце з удзельнікамі ансамбля: выкарыстанне прынцыпаў інтарэсу, даступнасці, прафесійнай падрыхтоўкі і псіхалагічнай сумяшчальнасці.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Тэма 4. Развіццё навыкаў чытання нот з ліста*

Чытанне нот з ліста і яго значнасць для засваення і пашырэння педагагічнага і канцэртнага рэпертуару. Чытанне нот з ліста як здольнасць чуць унутраным слыхам фактуру музычнага твора ў працэсе візуальнага ўспрымання нотнага тэксту і наступнае ўвасабленне пачутага ў рэальным гучанні.

Спосабы развіцця навыкаў чытання нот з ліста. Прынцып чытання нот з ліста: бачу – чую – выконваю на інструменце. Умовы чытання нот з ліста: адлюстраванне асноўнага зместу твора; бесперапыннасць выканання; тэмп выканання, адпаведны характар твора; увасабленне мастацкага вобраза. Актывізацыя музычных здольнасцей у працэсе чытання нотнага тэксту ў складзе інструментальнага ансамбля духавых інструментаў.

*Тэма 5. Настройка духавых інструментаў*

Настройка духавых інструментаў як сістэма. Выкарыстанне розных спосабаў настройкі духавых інструментаў: меладычная настройка, гарманічная настройка. Асаблівасці карэкціроўкі і кантролю настройкі духавых інструментаў у працэсе ансамблевага выканальніцтва. Прынцып ладатанальнага цягацення, выкарыстанне дадатковай аплікатуры, змяненне параметраў апертуры і амбушура, карэкцыя экспрэсіі выканальніцкага дыхання.

*Тэма 6. Інтанаванне ў практыцы ансамблевага выканальніцтва на духавых інструментах*

Спецыфіка інтанавання на медных і драўляных духавых інструментах. Узаемаабумоўленасць дакладнага інтанавання і канструктыўных асаблівасцей духавых інструментаў у саставе адпаведнага ансамбля.

Узаемаабумоўленасць інтанавання і арганалагічных асаблівасцей духавых інструментаў. Недахопы канструкцый амбушурных інструментаў і шляхі іх пераадольвання за кошт прафесійнага выканальніцкага майстэрства.

*Тэма 7. Сродкі выканальніцкай выразнасці як аснова мастацкага майстэрства ўдзельнікаў ансамбля духавых інструментаў*

Агульная характарыстыка, асноўныя функцыі і ўзаемадзеянне сродкаў выканальніцкай выразнасці: дынаміка, тэмп, метра-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

рытм, артыкуляцыя, штрыхавая тэхніка і інш. Спецыфіка адбору сродкаў выканальніцкай выразнасці ў ансамблевай практыцы: агульнамузычныя, інструментальныя (спецыфічныя для духавых інструментаў), індывідуальныя (выкананне канкрэтнага твора) мастацкія задачы.

*Тэма 8. Праблемы дынаміка-акустычнага балансу ў гучанні інструментальнага ансамбля*

Дынамічны патэнцыял ансамбля духавых інструментаў. Адносны ўзровень абазначэння дынамікі, градацыі гучнасці. Паняцце аб рэльефе, фоне, аб'ёме і балансе. Шляхі дасягнення аб'ёму прасторавага гучання ансамбля. Гукавая перспектыва: гарызанталь і вертыкаль музычнай фактуры. Узаемасувязь дынамікі і музычнай фактуры ў працэсе ансамблевага выканальніцтва.

Развіццё выканальніцкіх навыкаў для дасягнення збалансаванага гучання. Прынцыпы кантрасту дынамікі гучання ансамбля духавых інструментаў. Развіццё навыкаў скасавання дынаміка-акустычнага дысбалансу гучання на духавых інструментах: камерна-інструментальныя ансамблі з фартэпіяна, аднародныя, роднасныя і змешаныя саставы. Фарміраванне ўменняў дасягнення неабходнага дынаміка-акустычнага гучання.

*Тэма 9. Асаблівасці работы над метрарытмічнымі цяжкасцямі*

Паняцці «метр» і «рытм», іх сутнасць у музычным мастацтве. Шляхі дасягнення дакладнасці метрарытму ў інструментальных ансамблях з фартэпіяна, у аднародных, роднасных і змешаных саставах. Выкарыстанне інструктыўнага матэрыялу: музычныя практыкаванні, гамы, эцюды. Вывучэнне тыпавых рытмаформул і метрарытмічных камбінацый. Дакладны метрарытм як аснова праяўлення агогікі ў ансамблевай практыцы. Мастацкая мера агагічных адхіленняў, закон кампенсацыі.

*Тэма 10. Штрыхі як сродак музычнай выразнасці*

Штрыхі: сутнасць, вызначэнне, функцыянальныя асаблівасці і спецыфіка выкарыстання ў практыцы духавога ансамблевага выканальніцтва. Параўнальны аналіз, тэхналогія выканання штрыхоў на розных музычных інструментах і асаблівасці выкарыстання штрыхавой тэхнікі ў ансамблях духавых інструментаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Тэхналогія выканання асноўных штрыхоў на медных і драўляных духавых інструментах. Асаблівасці ўдасканалення тэхнікі і навыкаў выканання штрыхоў пры дапамозе цвёрдай атакі языка (detache, staccato, staccatissimo, marcato, martele). Асаблівасці ўдасканалення тэхнікі выканання штрыхоў пры дапамозе мяккай атакі языка (non legato, portato), асаблівасці пачатку гуку пры выкананні штрыха legato.

### *Тэма 11. Спецыфічныя прыёмы выканальніцтва на духавых інструментах*

Спецыфічныя прыёмы гуказдабывання: фрулата, флажалеты, двухгалоссе, глісанда, партамента, смарцата, шэйк, слэп, субтон, языковая сурдзіна, эфект зурны. Інтэрвальная і акордавая тэхніка. Мікраінтэрвалы. Нетрадыцыйная нотная графіка. Асаблівасці выкарыстання і вывучэння спецыфічных прыёмаў выканальніцтва ў інструментальным ансамблі. Значэнне вібрата ў ансамблевым выканальніцтве.

### *Тэма 12. Фразіроўка ў ансамблевым выканальніцтве*

Музычная фразіроўка як эфектыўны сродак мастацка-выканальніцкай выразнасці. Паняцце «фразіроўка», яе сутнасць, значнасць і роля ў працэсе сумеснага выканальніцтва ў складзе духавых ансамбляў. Элементы фразіроўкі: матыў, фраза, сказ, перыяд. Узаемасувязь фразіроўкі і музычнай драматургіі твора. Тэмпавыя суадносіны ў музычнай фразе: адзіны тэмп на працягу фразы, спецыфіка фразіроўкі з улікам агогікі.

Асаблівасці пабудовы фразіроўкі ў залежнасці ад жанравастылявых асаблівасцей твора. Фразіроўка ў арыгінальнай музыцы для ансамбля духавых інструментаў і пераалажэннях (апрацоўках, інструментоўках і інш.).

### *Тэма 13. Этапы работы над музычнымі творамі*

Этап першапачатковага знаёмства з творам (партытура, аўдыя- і відэазапіс, праслухоўванне трансляцыі сродкамі масавых камунікацый). Дэталёвы музычна-выканальніцкі аналіз асаблівасцей вывучаемага твора і задача па стварэнні адпаведных музычных вобразаў у працэсе ансамблевага выканальніцтва на духавых інструментах. Работа над асноўнымі эпізодамі музычнага твора (развіццё навыкаў сумеснага выканання з улікам тэхнічных ансамблевых цяжкасцей: дынамічны



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

баланс; штрыхі; фразіроўка; выкананне дробнай тэхнікі; інтанацыя і інш.). Шляхі вырашэння музычна-выканальніцкіх задач па стварэнні музычных вобразаў у працэсе канчатковага рэпетыцыйнага этапу ансамблевага выканальніцтва ў адпаведнасці з патрабаваннем твораў (арыгінал, інструментоўка і г. д.).

Комплексны аналіз музычнага твора: нотны тэкст, музычная форма, стылістыка, мастацкі вобраз. Выканальніцкі план музычнага твора: індывідуалізацыя аўтарскай задумы, пераасэнсаванне выканаўцам мастацкай ідэі твора, пералажэнне нотнага тэксту ў рэальнае гучанне і наступная крышталізацыя тэхналагічных рашэнняў у сферы выканальніцкай маторыкі.

### *Тэма 14. Увасабленне зместу музычных твораў, варыянтная шматлікасць іх трактовак*

Стварэнне мастацкага вобраза на аснове авалодання ўсімі сродкамі музычнай выразнасці. Інтэрпрэтацыя як тлумачэнне аўтарскіх тэкстаў, працэс выпрацоўкі пэўнай мастацкай канцэпцыі і пошуку выразных магчымасцей. Суадносіны кампазітарскага і выканальніцкага пачаткаў, шматлікасць трактовак.

### *Тэма 15. Спецыфіка інтэрпрэтацыі старадаўняй музыкі*

Вывучэнне асноў жанрава-стылявых кірункаў. Асаблівасці выканання старадаўняй музыкі і яе інтэрпрэтацыя. Параўнальны аналіз гістарычнай рэфлексіі музычнай арнаментыкі старадаўняй музыкі і асаблівасці яе расшыфроўкі ў выканальніцкім увасабленні.

Расшыфроўка знакаў скарачэння нотнага запісу і мелізматыкі. Разнастайнасць мелізмаў і іх расшыфроўка. Сутнасць *групета* і асаблівасці яго выканання. Разнавіднасці *мардэнта* і іх выканальніцкія трактоўкі. *Партамента*, *фаршлагі*, іх разнавіднасці і спецыфіка выканання. Выканальніцкая трактоўка разнавіднасцей трэлей (губная; пры дапамозе клапанаў, вентыляў ці помпавай механікі; пры дапамозе цуга) і тэхналогія іх выканання.

### *Тэма 16. Спецыфіка інтэрпрэтацыі сучаснай музыкі*

Асаблівасці выканання эстрадных і джазавых твораў з улікам спецыфічнай манеры і стылю выканання. Сучасная разнастайнасць музычнай арнаментыкі ў духавым выканальніцтве і праблемы яе расшыфроўкі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Тэхнічныя сродкі ў працэсе вывучэння жанрава-стылявых асаблівасцей сучаснай музыкі, выкарыстанне сінтэзатараў, камп'ютарная апрацоўка музычнага матэрыялу з мэтай стварэння фанаграм тыпу «-1». Дасягненне мастацкіх эфектаў шляхам злучэння ў саставе ансамбля духавых інструментаў і сучаснага музычнага інструментарыя – электрафікаваных сучасных музычных інструментаў (разнавіднасцей клавішных, бас-гітары), ударнай установкі, перкусіі і інш.

*Тэма 17. Падрыхтоўка да публічнага выступлення*

Публічнае выступленне як вынік выканальніцкай дзейнасці інструментальнага ансамбля. Эмацыянальна-псіхалагічная падрыхтоўка выканаўцаў. Спосабы пераадолення эстраднага хвалявання (уменне максімальна сабрацца ў адказны момант публічнага выступлення; аўтатрэнінг; вопыт папярэдняй канцэртнай дзейнасці). Прафесійная гігіена музыканта-выканаўцы. Самакантроль і валявая рэгуляцыя. Эмацыянальная аддача.

Роля публічных выступленняў у фарміраванні мастацкага густу і эстэтычнага выхавання слухачоў. Канцэртная дзейнасць як шлях удасканалення прафесійнага майстэрства ўдзельнікаў і кіраўнікоў ансамблевых калектываў. Арганізацыйныя пытанні падрыхтоўкі і правядзення канцэртнага выступлення.

Жанрава-стылявыя і сацыяльна-ўзроставыя ўмовы. Прынцып кантрасту, драматургічная і стылявая стройнасць праграмы выступлення. Дыферэнцыраваны падыход у складанні выконваемай канцэртнай праграмы, разлічанай на розны музычны густ той ці іншай сацыяльнай групы. Эстэтыка-сцэнічныя ўмовы – антураж, сцэнічны выгляд і імідж у адпаведнасці са стылем і эпохай выконваемых твораў. Пытанні акустыкі і тэхнічна-інструментальнага забеспячэння выступлення ў канцэртнай зале або на пленэры.

*Тэма 18. Творчыя дасягненні айчынных і замежных выканаўцаў на духавых інструментах у складзе інструментальных ансамбляў*

Асноўныя этапы развіцця і дасягненні айчыннага і сусветнага ансамблевага выканальніцтва. Персаналіі вядучых музыкантаў. Выкарыстанне прагрэсіўных тэхнічных прыстасаванняў у выканальніцкай практыцы вядучых спецыялістаў у галіне духавога мастацтва.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Аналіз творча-выканальніцкай дзейнасці і жанрава-тэматычнай накіраванасці канцэртнага рэпертуару вядучых замежных і айчынных музыкантаў у складзе ансамбляў розных інструментальных саставаў (на прыкладзе дыскаграфіі, аўдыя- і відэазапісаў конкурсных і канцэртных выступленняў).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

## Літаратура

*Асноўная*

1. *Апатский, В. Н.* Основы теории и методики духового музыкально-исполнительского искусства : учеб. пособие для муз. вузов / В. Н. Апатский. – Киев : Нац. муз. акад. Украины им. П. И. Чайковского, 2006. – 432 с.

2. *Бычков, О. В.* Формирование ансамблевой техники музыканта-исполнителя: метод. рекомендации / О. В. Бычков. – СПб. : С.-Петерб. гос. ун-т культуры и искусств, 2005. – 24 с.

3. *Вильсон, Г.* Психология артистической деятельности: таланты и поклонники / Г. Вильсон. – М. : Когито-центр, 2001. – 383 с.

4. *Григорьев, В. Ю.* Исполнитель и эстрада: мастер-класс / В. Ю. Григорьев. – М. : Классика, 2006. – 156 с.

5. *Диков, Б. А.* Настройка духовых инструментов / Б. А. Диков // Методика обучения игре на духовых инструментах. – Вып. 4. – М. : Музыка, 1976. – С. 71–85.

6. *Диков, Б. А.* О штрихах духовых инструментов: методика обучения игре на духовых инструментах : сб. науч. ст. / Б. А. Диков, А. И. Седракян. – М. : Музыка, 1966. – Вып. 2. – С. 182–210.

7. *Дубравская, Т. Н.* Музыкальное искусство барокко: стили, жанры, традиции исполнения: сб. науч. тр. Моск. гос. консерватории им. П. И. Чайковского / Т. Н. Дубравская, А. М. Меркулов. – М. : Моск. гос. консерватория им. П. И. Чайковского, 2003. – 235 с.

8. *Зеленин, В. М.* Работа в классе ансамбля : метод. рекомендации / В. М. Зеленин. – Минск : Выш. шк., 1979. – 60 с.

9. *Карацееў, А. Л.* Ансамблі духавых інструментаў у гісторыі музычнай культуры Беларусі / А. Л. Карацееў // Актуальныя праблемы і навуковыя пошукі ў галіне культуры і мастацтва: тэз. дакл. на навук.-творч. канф., 19–20 крас. 1994 г. / Беларус. ун-т культуры. – Мінск, 1994. – С. 45–46.

10. *Кучакевич, К. В.* формирование музыканта в классе камерного ансамбля: метод. записки по вопросам музыкального образования : сб. ст. / К. В. Кучакевич. – М. , 1991. – Вып. 3. – С. 50–59.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*11. Некрасова, Г. В.* Камерная музыка для духовых инструментов с фортепиано (исторический обзор и некоторые вопросы интерпретации): музыкальное воспитание и образование : сб. науч. ст. / Г. В. Некрасова. – Минск : Гос. ин-т проблем культуры, 2001. – С. 104–116.

*12. Подуровский, В. Н.* Психологическая коррекция музыкально-педагогической деятельности : учеб. пособие для студентов высш. учеб. заведений / В. Н. Подуровский, Н. В. Суслова. – М. : Владос, 2001. – 318 с.

*13. Порвенков, В. Г.* Акустика и настройка музыкальных инструментов: метод. пособие по настройке / В. Г. Порвенков. – М. : Музыка, 1990. – 189 с.

*14. Скороходов, В. П.* Камерный ансамбль в системе музыкального образования. Вопросы репертуара и исполнительства: материалы науч. чтений / В. П. Скороходов. – Минск : Белорус. гос. ин-т проблем культуры, 2002. – 55 с.

*15. Федотов, А. А.* О возможностях чистого интонирования при игре на духовых инструментах: методика обучения игре на духовых инструментах : сб. науч. ст. / А. А. Федотов, В. В. Платоцкий. – М. : Музыка,1964. – Вып. 1. – С. 56–78.

*16. Финберг, М. Я.* Вопросы ансамблевого исполнительства : метод. рекомендации / М. Я. Финберг. – Минск : БГПУ, 1997. – 36 с.

*17. Яконюк, В. Л.* Вопросы оптимизации музыкального обучения и воспитания в высшей школе : науч. тр. Белорус. гос. акад. музыки / В. Л. Яконюк. – Минск : Белорус. гос. акад. музыки, 1993. – Вып. 3. – 210 с.

*18. Черных, А.* Советское духовое инструментальное искусство: справочник / А. Черных. – М. : Сов. композитор,1989. – 320 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Дадатковая*

*1. Аджемов, К. Х.* Камерный ансамбль. Педагогика и исполнительство: сб. науч. ст. / К. Х. Аджемов. – М. : Музыка, 1979. – 167 с. : нот.

*2. Волков, Н. М.* Методическое пособие по истории исполнительства на духовых инструментах / Н. М. Волков. – Минск : Респ. науч.-метод. центр нар. творчества и культуры, 1989. – 20 с.

*3. Волков, Н. М.* Физические и психофизиологические предпосылки образования звука на трубе и проблемы исполни-

тельской артикуляции / Н. М. Волков. – Минск : БГАМ, 2004. – 169 с.

*4. Воронина, Т. А.* О мастерстве ансамблиста : сб. науч. тр. / Т. А. Воронина. – Л. : Музыка, 1986. – 145 с.

*5. Меркулов, А. М.* Как исполнять Моцарта : сб. науч. ст. / А. М. Меркулов. – М. : Классика, 2004. – 177 с.

*6. Карацееў, А. Л.* Роля прагрэсіўных тэхналогій падрыхтоўкі спецыялістаў духавога мастацтва ў працэсе распрацоўкі сучасных адукацыйных стандартаў / А. Л. Карацееў // Стандарты вышэйшай культуралагічнай і мастацкай адукацыі: тэарэтыка-метадалагічныя аспекты : матэрыялы навук.-метад. канф., 2–3 лют. 1999 г. – Мінск : Беларус. ун-т культуры, 1999. – С. 91–96.

*7. Ничков, Б. В*. Духовая инструментальная культура Беларуси / Б. В. Ничков. – Минск : БГАМ, 2003. – 426 с.

*8. Радвилович, А. Ю.* Инструментарий новой музыки второй половины двадцатого века: на примере камерных жанров в творчестве зарубежных композиторов 1960–1980 гг. : вопросы исполнительства / А. Ю. Радвилович. – СПб. : С.-Петерб. гуманитарный ун-т профсоюзов, 2007. – 21 с.

*9. Усов, Ю. А.* Вопросы музыкальной педагогики : сб. метод. ст. / Ю. А. Усов. – М. : Музыка,1983. – Вып. 4. – 128 с.

*10. Усов, Ю. А.* История зарубежного исполнительства на духовых инструментах : учеб. пособие для муз. вузов / Ю. А. Усов. – М. : Музыка, 1989. – 208 с.

*11. Усов, Ю. А.* История отечественного исполнительства на духовых инструментах : учеб. пособие для муз. вузов / Ю. А. Усов. – М. : Музыка, 1975. – 195 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Пералік рэкамендаваных сродкаў дыягностыкі вынікаў вучэбнай дзейнасці студэнтаў

Кантроль вучэбнай дзейнасці студэнтаў па дысцыпліне «Інструментальны ансамбль» здзяйсняецца з дапамогай наступных сродкаў дыягностыкі засваення матэрыялу:

– кантрольныя заняткі;
– акадэмічныя канцэрты;
– заданні для самастойнай работы;
– кантроль самастойнай работы;
– канцэртная дзейнасць;
– залікі;
– экзамены.

## Арганізацыя самастойнай работы студэнтаў:

– планаванне самастойных заняткаў;
– наведванне рэпетыцый вучэбных і прафесійных інструментальных калектываў;
– практычнае азнаямленне і аналіз нотнага і метадычнага матэрыялу з мэтай выкарыстання яго ў вучэбным працэсе.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Вучэбнае выданне*

**ІНСТРУМЕНТАЛЬНЫ АНСАМБЛЬ**

*Вучэбная праграма*
*ўстановы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне*
*для спецыяльнасці 1-18 01 01 Народная творчасць (па напрамках),*
*напрамку спецыяльнасці 1-18 01 01-02 Народная творчасць*
*(інструментальная музыка),*
*спецыялізацыі 1-18 01 01-02 02 Інструментальная музыка духавая*

Карэктар В. Б. Кудласевіч
Тэхнічны рэдактар Л. М. Мельнік

Падпісана ў друк 2016. Фармат 60x84 $^1/_{16}$.
Папера офісная. Рызаграфія.
Ум. друк. арк. 1,04. Ул.-выд. арк. 0,64. Тыраж экз. Заказ .

Выдавец і паліграфічнае выкананне:
УА «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы,
распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 1/177 ад 12.02.2014.
ЛП № 02330/456 ад 23.01.2014.
Вул. Рабкораўская, 17, 220007, г. Мінск.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ